Н43

БИБЛИОТЕКА БГУ

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

21 студзеня 2008 года, № 1 (1973)

СУПРАЦОЎНІЦТВА

ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ АМАНА

Дэлегацыя Міністэрства вышэйшай адукацыі Султаната Аман на чале з намеснікам міністра Абдулой Бен Мухамедам аль-Сармі наведала наш універсітэт 15 снежня ў рамках свайго візіту ў Беларусь.

На перамовах кіраўніцтва БДУ з дэлегацыяй Султаната Аман.

Мэта візіту дэлегацыі ў нашую краіну – вывучэнне перспектыў супрацоўніцтва паміж дзвюма дзяржавамі ў сферы вышэйшай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Так, напрыклад, аманскі бок разглядае магчымасць накіравання студэнтаў у Беларусь для навучання, у прыватнасці, па спецыяльнасцях фізічнага профілю. Гэтае пытанне асабліва актуальна ў сувязі з планамі манархій Аравійскага паўвострава ў бліжэйшы час прыступіць да будаўніцтва атамных электрастанцый.

Госці наведалі фізічны і геаграфічны факультэты Белдзяржуніверсітэта, пабачылі навукова-даследчыя лабараторыі. Затым у рэктараце адбылася іх сустрэча з рэктарам Васілём Стражавым і прарэктарам па навуцы Уладзімірам Паньковым. Тут жа была прадстаўлена прэзентацыя навукова-тэхнічных распрацовак вучоных БДУ. У выніку дасягнута прынцыповая дамоўленасць наконт падпісання пагаднення аб супрацоўніцтве і візіце беларускай дэлегацыі ў Султанат Аман.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

АКТУАЛЬНА

АДТЭРМІНОЎКА НА ПАСТУПЛЕННЕ

У Беларусі аспіранты і дактаранты, а таксама абітурыенты атрымалі адтэрміноўку ад службы ў войску.

Прызыўная кампанія ў Беларусі сёлета праводзіцца з улікам змяненняў і дапаўненняў, унесеных у закон "Аб воінскім абавязку і вайсковай службе". Як паведаміў першы намеснік галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл Ігар Козел, гэты дакумент значна пашырае колькасць грамадзян, якія маюць права на адтэрміноўку ад прызыву на тэрміновую вайсковую службу ці службу ў рэзерве. Цяпер да гэтай катэгорыі аднесены аспіранты і дактаранты не толькі вочнай, але і завочнай формы навучання. Акрамя таго, права на адтэрміноўку ад прызыву для паступлення ў ВНУ атрымалі і выпускнікі ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй адукацыі. Адтэрміноўка ад прызыву таксама даецца грамадзянам, адлічаным з ПТВ, ССНУ і ВНУ, у тым ліку і тым, хто знаходзіцца за мяжой, незалежна ад формы навучання, за выключэннем адлічаных за непаспяховасць і недысцыплінаванасць.

Ігар Козел таксама паведаміў, што ў банк даных аб грамадзянах, якім часова забаронены выезд з Беларусі, уносіцца інфармацыя пра тыць, хто ўхіляецца ад мерапрыемстваў прызыву на тэрміновую вайсковую службу ці службу ў рэзерве. "Пасля яўкі такіх грамадзян і высвятлення прычын іх адсутнасці па заяве вайсковых камісарыятаў іх імёны будуць выключаныя з банку даных", – адзначыў суразмоўца.

Паводле інфармацыі БелТА

ВЫСТАВЫ

У будынку рэктарата Белдзяржуніверсітэта з 4 па 18 студзеня дзейнічала духоўна-асветная фотавыстава "Праваслаўныя храмы Літвы".

ЛІТОЎСКАЕ ПРАВАСЛАЎЕ (ВАЧЫМА НАШЫХ СУАЙЧЫННІКАЎ)

На выставе дэманстравалася 65 мастацкіх фотаработ з выявамі 45-ці храмаў. Аўтар выставы – іерэй Алег Штэльман. Родам ён з Беларусі, у 1991 г. паступіў у Віленскі Свята-Духаў манастыр, а з 2002 г. служыць у Клайпедзе ў храме Усіх Святых, што на Зямлі Расійскай Празялі. Дарэчы, праваслаўная вера атрымала распаўсюджанне ў Літве ўжо ў XIV ст. Святыя Віленскія пакутнікі Антоній, Іаан і Яўстафій пацярпелі ад паганцаў за Хрыста ў 1347 г. задоўга да прыходу сюды каталіцызму.

Калекцыю айцец Алег пачаў збіраць з 2003 г. У 2007 г. выйшаў каляндар з яго фатаздымкамі праваслаўных храмаў Літвы, да выдання рыхтуецца фотаальбом. Выстава пабывала ў многіх гарадах Літвы, а таксама двойчы ў Сойме гэтай краіны.

У нашым універсітэце яна была арганізавана пры падтрымцы Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы і Саюза жанчын БДУ. На яе адкрыцці з прывітальным словам выступіў рэктар прафесар Васіль Стражаў, а таксама епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім.

Лейла ІСМАІЛАВА

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

АРГАНІЗАЦЫЙНА-ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА, ВОЛЬНЫ ЧАС І ЎМОВЫ ПРАЖЫВАННЯ СТУДЭНТАЎ У ІНТЭРНАТАХ БДУ

З даклада дырэктара Студгарадка Міхаіла ЧАРАПЕННІКАВА

Стар. 2

"У АСНОВЕ МАЁЙ ДЗЕЙНАСЦІ – САЦЫЯЛЬНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ ГРАМАДСТВА"

Інтэрв'ю з загадчыкам кафедры сацыяльнай работы ДзІКСТ БДУ прафесарам Эдуардам ЗБАРОЎСКІМ

Стар. 3

ТАЦЦЯНІН ДЗЕНЬ

Гутарка з лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта краіны, дацэнтам факультэта журналістыкі Таццянай ПАДАЛЯК

Стар. 4

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

Урачыстае пасяджэнне Вучонага савета БДУ, прысвечанае Дню навукі, адбудзецца 25 студзеня. З дакладам на тэму "Моладзь у навуцы" выступіць кіраўнік Галоўнага ўпраўлення навукі Таццяна Дзік. Пачатак у 10.15.

АДУКАЦЫЯ

Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Радзькоў.

ІНІЦЫЯТЫВЫ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ

Міністэрства адукацыі падрыхтавала каля 20-ці прапаноў па змяненні правілаў прыёму ў ВНУ і ССНУ.

Аб гэтым паведаміў журналістам 11 студзеня падчас рэспубліканскай нарады работнікаў сістэмы адукацыі міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў. Па яго словах, спецыялісты міністэрства ўлічылі пажаданні камісіі Дзяржкантролю, абітурыентаў і іх бацькоў і падрыхтавалі некаторыя змяненні. Напрыклад, прадугледжваецца права для дзяцей-інвалідаў, інвалідаў 1-й і 2-й груп, якія маюць агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную або сярэднюю спецыяльную адукацыю, пры адсутнасці медыцынскіх проціпаказанняў удзельнічаць у конкурсе на навучанне за кошт бюджэту па завочнай форме для атрымання вышэйшай адукацыі. Раней, каб паступіць у ВНУ на завочнае аддзяленне, пералічаныя групы абітурыентаў павінны былі працаваць або скончыць ССНУ па профілі абранай імі спецыяльнасці.

Мяркуецца таксама ўвесці аднолькавыя ўмовы для падачы дакументаў у розныя ВНУ і ССНУ як для абітурыентаў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе на навучанне за кошт бюджэту, так і на ўмовах аплаты. Акрамя таго, плануецца адмяніць права ВНУ ўстанаўліваць уласныя ўступныя іспыты па тых прадметах, па якіх праводзіцца цэнтралізаванае тэсціраванне. Пасля гэтага ўнутраныя ўступныя экзамены фактычна застануцца толькі для спецыяльнасцяў, звязаных з фізкультурай, творчасцю, журналістыкай і г.д.

Мінадукацыі лічыць неабходным таксама атрыманне абітурыентамі рэкамендацый пры паступленні на некаторыя публічныя спецыяльнасці, такія як "Міжнародныя адносіны", "Журналістыка", "Дзяржаўнае кіраванне". "І школа, і ўпраўленне адукацыі на месцах лепш ведаюць сваіх выпускнікоў і могуць вызначыць, ці з'яўляецца канкрэтны кандыдат на паступленне публічным чалавекам, ці ўмее ён выступаць, размаўляць з людзьмі, ці з'яўляецца ён актывістам у грамадскім жыцці класа або школы і г. д.", – пракаментаваў Аляксандр Радзькоў. Абітурыент пры паступленні на такія спецыяльнасці павінен быць падрыхтаваным не толькі па прадметах, але і быць адказным лідарам, гатовым абараняць гонар сваёй краіны на міжнародным узроўні. Атрыманне такіх рэкамендацый, якія будуць складацца з улікам меркавання педагогаў і кіраўніцтва адпаведнай навучальнай установы, плануецца ў мясцовых упраўленнях адукацыі.

Урэшце, Міністэрства адукацыі прапануе ўвесці рэгістрацыйны ўнёсак за здачу цэнтралізаванага тэсціравання. Паводле папярэдніх разлікаў ён складзе суму каля 10 тыс. руб. за ўдзел у адным экзамене. Дадзеная мера павінна павысіць адказнасць абітурыентаў за запіс на тое ці іншае ЦТ.

Паводле інфармацыі БелТА
Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА

УНІВЕРСІТЭТ

21 студзеня 2008 года, № 1 (1973)

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

АРГАНІЗАЦЫЙНА-ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА, ВОЛЬНЫ ЧАС І ЎМОВЫ ПРАЖЫВАННЯ СТУДЭНТАЎ У ІНТЭРНАТАХ БДУ

З даклада дырэктара Студэнцкага гарадка, намесніка прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Міхаіла ЧАРАПЕННІКАВА на пасяджэнні Вучонага савета БДУ 22 снежня 2007 г.

Забеспячэнне месцамі ў інтэрнатах

Па стане на 01.12.2007 г. у студэнцкіх інтэрнатах пражывае 5 368 чалавек (забяспечанасць месцамі студэнтаў склала 56,4 %). Як відаць на слайдзе 1, апошнім часам назіраецца зніжэнне працэнта забяспечанасці студэнтаў месцамі ў інтэрнаце. Гэта тлумачыцца трыма асноўнымі прычынамі:

1) павелічэннем агульнай колькасці студэнтаў дзённай формы навучання ва універсітэце (з 13,5 тыс. у 2003 г. да болей чым 18 тыс. у 2007 г.);

Варта спыніцца на забеспячэнні студэнтаў, якія валодаюць правамі на пазачарговае і першачарговае атрыманне месцаў у інтэрнаце (студэнты-сіроты, інваліды, студэнты са шматдзетных сем'яў, пацярпелыя ад аварыі на ЧАЭС, агульнаўніверсітэцкі актыў, выбітныя спартоўцы, чальцы будатрадаў), і замежных студэнтаў. Агульная колькасць такіх прэтэндэнтаў па БДУ складае 48,4 % ад агульнай колькасці тых, хто пражывае ў інтэрнатах. Дарэчы, "актывісты", спартоўцы і чальцы будатрадаў складаюць усяго 8 % (гл. слайд 2),

Слайд 1. Забяспечанасць студэнтаў месцамі ў інтэрнаце.

	Фізічны факультэт		ФРФіЭ		ФПМІ	
	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці
2005/06	344	78	434	78	573	78
2006/07	270	84	360	84	437	98
2007/08	359	47	466	52	518	62

	ММФ		Хімічны факультэт		Біялагічны факультэт	
	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці
2005/06	523	80	429	79	474	72
2006/07	500	78	374	85	487	64
2007/08	510	56	397	61	456	54

	Геаграфічны факультэт		Філалагічны факультэт		Гістарычны факультэт	
	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці
2005/06	451	78	1046	64	565	60
2006/07	386	80	813	81	500	65
2007/08	357	62	714	67	518	56

	ФФСН		Факультэт журналістыкі		Эканамічны факультэт	
	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці
2005/06	342	65	473	55	286	65
2006/07	290	69	446	60	346	71
2007/08	263	48	534	47	439	47

	ФМА		Юрыдычны факультэт		ДзІКСТ	
	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці
2005/06	1472	30	750	59	532	42
2006/07	1618	36	652	70	341	75
2007/08	1353	41	559	64	365	55

	Гуманітарны факультэт		ІБМТ	
	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці
2005/06	253	30	32	72
2006/07	476	50	43	84
2007/08	610	45	61	70

2) павелічэннем долі іншагародніх студэнтаў у БДУ (з 40 % у 2003 г. да 56 % у 2007 г.);

3) закрыццём у 2007 г. інтэрната № 7 на капітальны рамонт.

Нязначнае павелічэнне на шэрагу факультэтаў працэнта забяспечанасці месцамі ў інтэрнаце ў 2006/07 навуч. г. звязана як з асаблівасцямі прыёму абітурыентаў на гэтыя факультэты паводле змянення Правілаў прыёму ў ВНУ, так і з пераходам да заяўляльнага прынцыпу ўліку тых, хто мае патрэбу ў інтэрнаце.

За апошнія тры гады склаліся наступныя асаблівасці атрымання месца ў інтэрнаце:

- асноўным крытэрыям для засялення стаў бал паспяховасці студэнта;

- у забеспячэнні інтэрнатам не робіцца ніякіх адрозненняў паміж студэнтамі платнай і бюджэтнай формамі навучання;

- праводзіцца паступовая, мэтанакіраваная карэктоўка колькасці месцаў, адведзеных факультэтам, з мэтай выраўноўвання працэнта забяспечанасці месцамі студэнтаў розных факультэтаў з улікам сацыяльнага фактара і змянення структуры БДУ (напрыклад, стварэнне гуманітарнага і ваеннага факультэтаў);

- працэс атрымання месцаў у інтэрнаце набыў больш адкрыты характар (актыўны ўдзел у размеркаванні месцаў на факультэце прымаюць самі студэнты, у перыяд засялення арганізавана работа "гарачай тэлефоннай лініі", інфармацыя аб атрыманні месцаў і найме жылля размешчана на сайце БДУ *www.bsu.by*);

- павялічваецца доля студэнтаў I курса (найбольш сацыяльна неабароненых), якім даюцца месцы ў інтэрнаце;

- працэс атрымання месца ў інтэрнаце, дзякуючы шчыльнаму супрацоўніцтву факультэтаў, Студэнцкага гарадка і іншых універсітэцкіх службаў, а таксама студэнцкага прафсаюза, арганізаваны паводле прынцыпу "аднаго вакна" (ад падачы заявы да засялення ў канкрэтны пакой).

Слайд 2. Звесткі пра студэнтаў, якія маюць права на пазачарговае і першачарговае атрыманне інтэрната (48,4 % ад агульнай колькасці тых, хто пражывае ў 2007/08 навуч. г.).

гэта значыць, што больш за палову студэнтаў, якія з'яўляюцца жыхарамі інтэрнатаў, засяляюцца, не маючы льгот. Пры гэтым падтрымка сацыяльна неабароненых катэгорый грамадзян з'яўляецца дзяржаўным прыярытэтам, а навучанне замежнікаў – яшчэ і пытаннем прэстыжу ВНУ.

На слайдзе 3 прыведзены даныя аб забяспечанасці месцамі студэнтаў, якія не валодаюць ільготамі (у разрэзе факультэтаў). Трэба адзначыць, што гэтая лічба з'яўляецца вельмі паказальнай з пункту гледжання рэальнай забяспечанасці факультэтаў месцамі і на большасці факультэтах блізкая да (27±8)%, то-бок рэальная забяспечанасць студэнтаў практычна ўсіх факультэтаў месцамі ў інтэрнаце прыблізна аднолькавая. Істотна ніжэйшая забяспечанасць месцамі ў інтэрнаце назіраецца сярод студэнтаў ФФСН і эканамічнага факультэта, што, безумоўна, павінна быць улічана пры размеркаванні месцаў у наступным навучальным годзе.

Гаворачы пра сярэдні бал паспяховасці, неабходны для засялення (гл. слайд 4), варта адзначыць наступнае: практычна на ўсіх факультэтах гэты бал трошкі вышэйшы (не больш чым на 1,5), а ў ІБМТ і на юрыдычным факультэце нават ніжэйшы за сярэдні бал паспяховасці па факультэце. Даныя сведчаць аб тым, што засяліцца ў інтэрнат можа звычайны, "сярэдні" студэнт факультэта, які не мае ніякіх ільгот. Занепакоенасць выклікаюць надзвычай высокія паказальнікі сярэдніх балаў, неабходных для засялення, на фізічным (9,0) і філалагічным (9,8) факультэтах.

Слайд 3. Звесткі пра студэнтаў, якія маюць права на пазачарговае і першачарговае атрыманне інтэрната ў 2007/08 навуч. г. (у разрэзе факультэтаў).

Факультэт	Колькасць ільготнікаў	Колькасць месцаў	Працэнт ільготнікаў ад колькасці месцаў	Колькасць тых, хто мае патрэбу	Працэнт забяспечанасці студэнтаў без ільгот
Біялагічны	90	248	36	456	35
Геаграфічны	96	221	43	357	35
ДзІКСТ	85	200	43	365	32
Гуманітарны	134	273	49	610	23
Журналістыкі	115	252	46	534	26
Гістарычны	168	288	58	518	23
ММФ	101	288	35	510	37
Фізічны	88	170	52	359	23
Філалагічны	319	475	67	714	22
ФМА	265	551	48	1353	21
ФПМІ	134	322	42	518	36
ФРФіЭ	123	241	51	466	25
ФФСН	74	125	59	263	19
Хімічны	87	241	36	397	39
Эканамічны	149	208	72	439	13
Юрыдычны	186	359	52	559	31

Выхаваўчая і ідэалагічная работа

Педагагічныя кадры Студэнцкага гарадка рэгулярна праходзяць павышэнне кваліфікацыі, у тым ліку і перападрыхтоўку, на базе РІВШ. У мэтах павышэння адукацыйнага ўзроўню і кіраўніцкай культуры педагогаў і прадстаўнікоў студэнцкага актыву арганізуюцца інфармацыйна-метадычныя пасяджэнні, метадычныя заняткі, "панарамы" досведу, функцыянуе пастаянны семінар па актуальных пытаннях педагогікі з прыцягненнем вядучых супрацоўнікаў універсітэта і іншых спецыялістаў. Для падрыхтоўкі і навучання студэнцкіх лідараў у Студэнцкім гарадку арганізавана круглагадовая Школа студэнцкага актыву.

Вынікі метадычнай дзейнасці адлюстраваны ў распрацаванай і выдадзенай метадычнай прадукцыі (у 2007 г. – 8 выданняў агульным аб'ёмам 47,66 друкав. арк. – 669 с., у тым ліку 2 вучэбных выданні аб'ёмам 13,25 друкав. арк. – 227 с.).

Наяўнасць дакладна выпрацаванай ў 2006/07 навуч. г. сістэмы прафілактыкі і выяўлення парушэнняў, а таксама працэдуры прымянення дысцыплінарных уздзеянняў, іх апратэставання і адмены садзейнічае захаванню тэндэнцыі зніжэння колькасці і відаў парушэнняў студэнтамі універсітэта Правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах БДУ – на 50 % (у параўнанні з 2005/06 навуч. г.), прычым колькасць грубых і асабліва грубых парушэнняў знізілася практычна ў 3 разы.

Вялікая ўвага ў Студэнцкім гарадку надаецца падтрымцы і сістэмнаму развіццю органаў студэнцкага самакіравання, дзякуючы чаму апошнія, як сведчаць вынікі анкетавання, карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам сярод студэнтаў. У 2006/07 навуч. г. былі зацверджаныя ў новай рэдакцыі нарматыўныя дакументы, што рэгламентуюць дзейнасць органаў студэнцкага самакіравання.

У 2006/07 навуч. г. у выхаваўчы працэс ўкараняліся новыя формы ідэалагічнай і выхаваўчай работы: адкрыты гарадскі фестываль моладзевых відэароліка ў "Кінагрань"; рэгулярныя канферэнцыі ў рэжыме он-лайн з дырэктарам Студгарадка па актуальных пытаннях жыццядзейнасці інтэрнатаў (1 раз у квартал); конкурс "Студэнцкі лідар года"; акцыя "Годнае дзяцінства".

Слайд 4. Звесткі аб сярэднім бале паспяховасці, неабходным для засялення ў 2007/08 навуч. г. (у разрэзе факультэтаў).

Факультэт	Сярэдні бал па факультэце	Сярэдні бал, неабходны для засялення
Біялагічны	6,8	7,0
Геаграфічны	7,3	7,8
ДзІКСТ	6,9	8,0
Гуманітарны	7,0	8,3
Журналістыкі	7,1	8,0
ІБМТ	6,7	5,0
Гістарычны	7,5	8,5
ММФ	6,8	7,2
Фізічны	6,7	9,0
Філалагічны	7,9	9,8
ФМА	7,6	8,8
ФРФіЭ	6,6	7,4
ФФСН	7,6	8,0
Хімічны	6,8	7,0
Эканамічны	6,9	8,5
Юрыдычны	7,3	7,0

Сфарміравана і пастаянна дзейнічае сетка гурткоў, студый, клубаў, спартыўных секцый. Штогод ладзяцца розныя масавыя мерапрыемствы – конкурсы, фестывалі, вечары, розныя спартыўныя спаборніцтвы. У інтэрнатах абсталяваны пакоі сацыяльна-культурнага прызначэння (спартыўныя, трэнажорныя і чытальныя залы, пакоі самакіравання і інш.).

Больш падрабязная інфармацыя змешчана ў фільме-прэзентацыі "Студэнцкі гарадок" *(http://intranet.bsu/video/)*.

Сацыяльна-бытавыя ўмовы пражывання студэнтаў і стан матэрыяльна-тэхнічнай базы

Агульны аб'ём капіталаўкладанняў, што пайшлі на патрэбы інтэрнатаў Студэнцкага гарадка ў 2007 г. (10 месяцаў) – без уліку камунальных плацяжоў, на якія выдаткавана больш за 880 млн руб., і цякучых рамонтаў (110 млн руб.) – склаў больш чым 180 млн руб., у тым ліку за кошт пазабюджэтных сродкаў – 16,3 млн руб.

Інтэрнаты № 1, 2, 6, 10 па тэхнічнай і матэрыяльнай аснашчанасці адпавядаюць усім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да студэнцкага інтэрната. У 2005 г. інтэрнат № 6, а ў 2007 г. інтэрнат № 1 былі прызнаныя лепшымі студэнцкімі інтэрнатамі сталіцы.

Разам з тым, патрабуюць увагі наступныя моманты:

- узмацненне сумеснай дзейнасці ўсіх падраздзяленняў універсітэта, якія працуюць з замежнымі грамадзянамі;

- паніжэнне ўзроўню цякучасці кадраў педагагічных работнікаў інтэрната (адным з магчымых шляхоў вырашэння дадзенай праблемы з'яўляецца прыцягненне да працы маладых спецыялістаў па размеркаванні);

- неабходнасць стварэння і пастаяннага абнаўлення сайта Студэнцкага гарадка;

- неабходнасць стварэння, мадэрнізацыі і адміністравання кампутарных сетак у шэрагу інтэрнатаў;

- узмацненне кантролю за рацыянальным выкарыстаннем студэнтамі энергарэсурсаў і больш шырокае ўкараненне энергазберагальных тэхналогій;

- неабходнасць цеплавой рэабілітацыі корпуса "Г" інтэрната № 10 і інтэрната № 8;

- неабходнасць перыядычнай закупкі новай мэблі ў жылыя пакоі, спартыўных трэнажораў і інвентару для патрэбаў інтэрната;

- вострая патрэба універсітэта ў будаўніцтве новых інтэрнатаў.

МАНІТОРЫНГ

Для аб'ектыўнай ацэнкі дзейнасці падраздзяленняў Студгарадка было праведзена апытанне ва ўсіх інтэрнатах сярод 919-ці студэнтаў усіх курсаў і факультэтаў БДУ. Вынікі паказваюць, што студэнты высока ацэньваюць умовы пражывання ў інтэрнатах (8–10 балаў далі больш за палову апытаных, яшчэ 15 % "паставілі" 7–6 балаў) і ў дастатковай меры задаволены працай адміністрацыі і педагогаў (зменаў пажадала 2 % апытаных). Большасць з тых, хто пражывае ў інтэрнаце, станоўча ацэньваюць культурна-масавыя, спартыўныя мерапрыемствы і працу органаў студэнцкага самакіравання ("выдатна" і "добра" – больш за 50 %, "выдатна", "добра" і "здавальняльна" – больш за 65 %). Гэта з'яўляецца прызнаннем з боку студэнтаў дзейнасці універсітэцкіх службаў па паляпшэнні сацыяльна-бытавых умоў, правядзенні выхаваўчай і ідэалагічнай работы. Разам з тым, больш за траціну студэнтаў пажадалі змяніць умовы пражывання (пры гэтым 42 % апытаных задаволены існуючым становішчам), што звязана найперш з "ушчыльненнем" у 2005/07 гг. для павышэння забяспечанасці навучэнцаў інтэрнатам. Да таго ж 25 % рэспандэнтаў адзначылі, што альбо нічога не ведаюць пра мерапрыемствы, якія ладзяцца ў інтэрнаце, Студэнцкім гарадку і органамі самакіравання, альбо ім не хапае на гэта часу. Такім чынам, неабходна і надалей весці мэтанакіраваную працу па прыцягненні студэнтаў да актыўных формаў баўлення вольнага часу і ўдзелу ў сацыяльна значнай дзейнасці.

Эдуард ЗБАРОЎСКІ:

"У АСНОВЕ МАЁЙ ДЗЕЙНАСЦІ – САЦЫЯЛЬНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ ГРАМАДСТВА"

1 студзеня 2008 г. загадчыку кафедры сацыяльнай работы Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, доктару медыцынскіх навук прафесару Эдуарду ЗБАРОЎСКАМУ споўнілася 70 гадоў.

***

Астроўскі сляпы быў да ложка ўкаваны,
А Рузвельт без колаў не здольны на крок,
Бетховен па слыху быў абмежаваны,
І Сметана быў нешчаслівы на зрок.

У волатаў моцным не склалася цела,
Ды праца зрабіла бясконцым іх век.
Так вестка зямлянам з нябёс даляцела,
Каб бачыць і чуць, хто тут ёсць чалавек.

Аўтарам працытаваных вершаваных радкоў з'яўляецца сам юбіляр, які нават ва ўласнай творчасці не забываецца на сваю прафесію, а ў навуковай дзейнасці падыходзіць да ўсяго з творчым імпэтам. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў, у мінулым дырэктар прафілактычнай праграмы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя СІНДЗІ па Беларусі, старшыня Міждзяржаўнага каардынацыйнага савета па прафілактыцы неінфекцыйных хвароб пры Савеце па ахове здароўя краін СНД, ініцыятар і ачольнік першай Рэспубліканскай праграмы "Рэабілітацыя", аўтар больш як 300 навуковых публікацый, навуковы кіраўнік 15-ці кандыдатаў і дактароў медыцынскіх навук... – у адным інтэрв'ю наўрад ці хопіць месца, каб пералічыць усе дасягненні гэтага няўрымслівага чалавека, таму паспрабуем акрэсліць галоўныя моманты.

– Эдуард Іосіфавіч, чаму ў сваёй прафесійнай дзейнасці Вы засяродзіліся на працы з інвалідамі?

– Мой артыкул "Бяда – не віна" ў часопісе "Нёман" за 1989 год стаў першай публікацыяй у Савецкім саюзе, у якой абмяркоўвалася праблема інваліднасці ў краіне. Да таго часу ў СССР наконт людзей з абмежаванымі магчымасцямі афіцыйна ніхто не выступаў. Лічылася, нібыта гэтай праблемы проста няма. Пабываўшы за мяжой, я пабачыў, як там вырашаюць праблемы інваліднасці. У сваёй навуковай дзейнасці я пачаў займацца пытаннямі сацыяльнай інтэграцыі людзей, бо заўсёды быў упэўнены, што не столькі інвалідам патрэбна дапамога здаровых людзей, колькі так званай паўнавартаснай частцы грамадства неабходны інваліды, каб на каштоўнасцях агульначалавечай маралі гартавацца ў сваёй гуманнасці. Ніхто не застрахаваны ад хвароб, інваліднасці і старасці.

– Якім чынам гэтыя напрацоўкі і ідэі ўкараніліся ў Белдзяржуніверсітэце, і які грунт для гэтага трэба было падрыхтаваць?

– Яшчэ ў 1990 годзе ў Вашынгтоне прайшоў Першы рэабілітацыйны семінар ААН, на якім я выступаў з дакладам. Пасля ў сваёй абгрунтаванай справаздачы я адзначыў неабходнасць стварэння пры БДУ ці Мінскім медыцынскім інстытуце кафедры па падрыхтоўцы спецыялістаў па медыка-сацыяльных праблемах рэабілітацыі інвалідаў і арганізацыі курсаў падрыхтоўкі рэабілітолагаў. Прапанова знайшла станоўчы водгук у міністэрствах, але перашкаджала адсутнасць адпаведнай прававой базы па рэабілітацыі. У той час я ачольваў БелНДІ экспертызы працаздольнасці і арганізацыі працы інвалідаў і актыўна ўключыўся ў працэс распрацоўкі канцэпцыі і праектаў законаў. Першы закон "Аб сацыяльнай абароне інвалідаў РБ" быў прыняты ў 1991 годзе. Але хутка стала відавочным, што адной рэабілітацыяй усе праблемы вырашыць немагчыма і трэба стварыць сістэму прафілактычных захадаў. Па даручэнні ўлад я ўзначаліў калектыў па распрацоўцы другога закона "Аб папярэджванні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў" (1994). Галоўным вынікам работы над двума заканадаўчымі актамі стала адпаведная Дзяржаўная праграма, якая з дапаўненнямі дзейнічае і сёння. Паводле яе створана служба медыцынскай рэабілітацыі, у гарадах будуюцца пандусы, адбываецца інтэграцыя дзяцей з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця ў звычайныя школы, рыхтуюцца спецыялісты, ствараюцца рэабілітацыйныя тэхналогіі. Усё гэта падрыхтавала глебу для адкрыцця адпаведнай кафедры ў ВНУ.

– Што лягло ў аснову дзейнасці кафедры сацыяльнай работы, і па якіх кірунках яна працуе зараз?

– Рэалізацыю прынятай дзяржаўнай праграмы тармазіла адсутнасць кваліфікаваных кадраў. У БДУ мне прапанавалі распрацаваць спецыяльнасць, якая б вырашала гэтае пытанне, і я з энтузіазмам узяўся за справу. У выніку ў верасні 1999 года пры ДзІКСТ была адчынена кафедра сацыяльнай работы, якой і загадваю. Напачатку падрыхтоўка студэнтаў вялася па дзвюх спецыялізацыях: сацыяльна-псіхалагічная дапамога насельніцтву і сацыяльная рэабілітацыя асобы. Ну а сёння мы курыруем адзін з трох кірункаў сацыяльнай работы ў Беларусі – сацыяльна-медыка-псіхалагічная дзейнасць. У вучэбным працэсе мы шмат увагі надаем метадам і тэхналогіям сацыяльнай работы, псіхалогіі, этыкі, педагогікі, медыцыны. Галоўная задача нашых выкладчыкаў і студэнтаў – забеспячэнне фізічнага, псіхічнага і сацыяльнага дабрабыту чалавека (а гэта якраз і ёсць паняцце здароўя ў Статуце СААЗ). Увогуле, праблема сацыяльнай рэабілітацыі такая бязмежная, што аднаго жыцця на яе вырашэнне проста не хопіць. Таму я і свайго сына Канстанціна зацікавіў гэтай тэматыкай. Зараз ён узначальвае кафедру рэабіліталогіі, якая адкрылася ў нас ў 2004 годзе.

– Нягледзячы на напружаную навуковую дзейнасць і пастаянную работу са студэнтамі Вы знаходзіце час для творчасці...

– Свой першы верш я напісаў яшчэ ў 8-м класе. Але сур'ёзна заняўся паэзіяй пасля трагедыі на ЧАЭС. Гэтая бяда не мінула і мяне, бо родная вёска Ліхоўня апынулася ў пацярпелай зоне. Я многа пішу і з'яўляюся членам СБП. Ва ўсіх вершах уздымаю злабадзённыя сацыяльныя пытанні. Натуральна, што ў творах апісваю прафесійныя праблемы, якія ў рыфмах і вобразах кранаюць душэўныя струны чытача. Такія дысцыпліны, як "Этыка сацыяльнай работы" і "Філасофія сацыяльнай абароны чалавека" можна вывучаць па маіх паэтычных творах, якія студэнты часцяком прыносяць на семінарскія заняткі, рыхтуючы адказы. Такая форма работы цікавая і зразумелая. У мяне ўжо выйшла 8 паэтычных зборнікаў, сярод якіх "Гаючая памяць продкаў", "Таямніцы шчасця", "Чалавекам быць", "Крыж памяці", "Лёсы, апаленыя вайной", "Ствары сябе, чалавек". Кожную кнігу я пачынаю філасофскай прадмовай. Акрамя таго, сур'ёзна займаюся генеалогіяй. Гісторыя і этыка сям'і – любімыя тэмы ў маёй паэзіі.

– У скарбонцы Вашых навуковых дасягненняў ёсць і запатэнтаваныя вынаходніцтвы. Раскажыце пра іх падрабязней.

– Усе мае вынаходніцтвы тычацца новых метадаў даследавання стану здароўя. Самае унікальнае даследаванне я пачаў у заснаванай мною пры Інстытуце кардыялогіі лабараторыі сацыяльна-прафілактычнай кардыялогіі, мэтай якой стала прагназаванне сардэчных хвароб. На аснове назіранняў за 4-ма тысячамі мужчын з рознай канстытуцыяй і тэмпераментам было паказана, як можна вылічыць рызыку развіцця ішэмічнай хваробы сэрца ў людзей і вызначыць індывідуальныя асаблівасці прафілактыкі. Акрамя таго, я вынайшаў арыгінальны спосаб даследавання стану чалавека на аснове кандэнсату паветра, што выдыхаецца. Вынік – тры запатэнтаваныя сумесна з супрацоўнікамі лабараторыі вынаходніцтвы. Дарэчы, амаль усе мае распрацоўкі маюць інтэграваны характар і могуць быць карыснымі не толькі для спецыялістаў сацыяльнай сферы і медыкаў, але і для біёлагаў, хімікаў, псіхолагаў. Спадзяюся, што калі-небудзь вакол ідэі сацыяльнай работы аб'яднаецца ўвесь БДУ і спецыялісты з розных факультэтаў будуць разам займацца праблемамі існавання чалавека ў соцыуме. Сёння навука прасунулася далёка ў розных напрамках, але ў яе аснове павінен быць адзіны сацыя-медыка-псіхалагічны падмурак. Значны крок ў гэтым кірунку зрабіла "Агульнанацыянальная інтэграваная праграма прафілактыкі неінфекцыйных захворванняў" (СІНДЗІ), якая была заснавана ў 1984 годзе. Мне давялося ўдзельнічаць у першым абмеркаванні яе канцэпцыі ў Жэневе, а затым быць дырэктарам гэтай праграмы па Беларусі.

Гутарыла Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

СЛУЖБЫ БДУ

НА ВАРЦЕ УНІВЕРСІТЭТА!

Служба аховы і бяспекі (САіБ) БДУ ўтворана ў сакавіку 1997 г. У яе задачы ўваходзіць забеспячэнне грамадскага парадку і захаванасці матэрыяльных каштоўнасцяў, папярэджванне правапарушэнняў і злачынстваў на аб'ектах БДУ. Устаноўлены парадак вызначаецца Правіламі ўнутранага працоўнага распарадку і Палажэннем аб прапускным і ўнутрыаб'ектавым рэжыме, патрабаванні якіх з'яўляюцца абавязковымі для супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ, а таксама асоб, якія часова знаходзяцца ў адміністрацыйных і вучэбных будынках БДУ, і работнікаў арганізацый, якія арэндуюць універсітэцкія памяшканні.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2006 г. № 175-З "Аб ахоўнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь", Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 мая 2007 г. № 534 "Аб захадах па ўдасканаленні ахоўнай дзейнасці" і лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі БДУ работнікі САіБ маюць права на агляд дакументаў, транспартных сродкаў на тэрыторыі, дзе ахоўваюцца аб'екты.

Па выніках праверкі ў выпадку парушэнняў складаюцца акты. Можа прымацца рашэнне аб затрыманні асобы, якая здзейсніла замах адносна аб'екта, што ахоўваецца, ці на людзей, з далейшым тэрміновым інфармаваннем органаў унутраных спраў аб затрыманні гэтай асобы для дастаўкі супрацоўнікамі МУС у адпаведныя органы.

Задакументаваныя факты парушэнняў, дапушчаных супрацоўнікамі і студэнтамі БДУ, накіроўваюцца ў дэканаты і кіраўнікам структурных падраздзяленняў для інфармацыі і прыняцця рашэнняў. Справы аб адміністрацыйных правапарушэннях разглядаюць органы ўнутраных спраў. Курэнне ў месцах, дзе гэта забаронена адпаведна заканадаўчым актам, цягне за сабой накладанне штрафу ў памеры ад адной дзесятай да пяці дзесятых базавай велічыні. Распіванне алкагольных напояў у грамадскіх месцах ці з'яўленне на тэрыторыі БДУ ў стане ап'янення цягнуць накладанне штрафу ў памеры да васьмі базавых велічыняў.

Грамадзянін, які лічыць, што дзеянні работнікаў аховы пры правядзенні агляду ўшчамілі яго правы, свабоду і законныя інтарэсы, можа падаць рэктару скаргу на ўказаныя дзеянні.

Калі адносна вас здзейснена злачынства ці вы сталі яго сведкам, просім неадкладна паведаміць у САіБ па тэл. 209-50-02.

Віктар ПАЗНЯК,
намеснік начальніка САіБ

НА ЗАМЕТКУ

На тэрыторыі Маскоўскага раёна г. Мінска за 2007 год было здзейснена 1627 крадзяжоў мабільных тэлефонаў, што на 316 выпадкаў больш, чым у 2006 годзе.

СТОП, ЗЛОДЗЕЙ!

Злачынцы, карыстаючыся нядбаласцю і няўважлівасцю грамадзян, выкрадаюць мабільныя тэлефоны ў грамадскім транспарце, у месцах масавага збору людзей, ва ўстановах і арганізацыях. Грамадзяне, прыслухайцеся да нашых парад! Для бяспекі уласнай маёмасці неабходна захоўваць яе ў цяжкадаступных для злодзеяў месцах. Не насіце мабільныя тэлефоны, кашалькі і дакументы ў вонкавых кішэнях вопраткі, бо не заўважыце, як іх выкрадуць у шматлюдных месцах. Не захоўвайце каштоўнасці ў поліэтыленавых пакунках з прычыны таго, што іх лёгка парэзаць. Заходзячы ў грамадскі транспарт, правярайце, ці зачынены сумкі. Заўсёды трымайце іх навідавоку.

Не пакідайце мабільныя тэлефоны ў вярхняй вопратцы, калі здаеце яе ў гардэроб. Не набывайце мабільныя тэлефоны без дакументаў з рук і па аб'явах, бо такім чынам прадаюцца крадзеныя апараты. Памятайце, што карыстальнікі выкрадзеных мабільных тэлефонаў выяўляюцца супрацоўнікамі міліцыі па персанальным IMEI кодзе тэлефона, і ў гэтым выпадку апарат канфіскуецца. Ён можа быць вернуты ўласніку, нават калі яго карыстальнік з'яўляецца добрасумленным пакупніком. Такім чынам сёння раскрываецца кожны шосты крадзеж мабільных тэлефонаў, а асобы, якія здзейснілі злачынства, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці.

Калі ў вас выкралі мабільны тэлефон, тэрмінова звяртайцеся у міліцыю. Але нагадаем, што ў выпадку звароту ў органы ўнутраных спраў з заявай аб крадзяжы тэлефона, які насамрэч быў згублены, у дачыненні да вашай асобы можа быць узбуджана крымінальная справа паводле арт. 400 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь за свядомы непраўдзівы данос.

Памятайце, ваша неабачлівасць правакуе злодзеяў на здзяйсненне крадзяжоў. Захаванасць маёмасці залежыць ад вашай уважлівасці і асцярожнасці!

Віктар ЖЫНГЕЛЬ,
пракурор Маскоўскага раёна г. Мінска

АБ'ЯВЫ

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

аб'яўляе конкурс
на замяшчэнне пасады

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ прававых дысцыплін.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: г. Мінск, вул. Батанічная, 15, аддзел кадраў ДзІКСТа; тэл. 210-01-10.

ІНСТЫТУТ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ І ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ СУДДЗЯЎ, РАБОТНІКАЎ ПРАКУРАТУРЫ, СУДОЎ І ЎСТАНОЎ ЮСТЫЦЫІ БДУ

аб'яўляе конкурс
на замяшчэнне пасад

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:
- судовай дзейнасці (1);
- пракурорскай дзейнасці (1).

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 14, аддзел кадраў; тэл. 227-40-56.

РЭДАКЦЫЯ ЧАСОПІСА "НОВАЯ ЭКАНОМІКА"

прапануе магістрантам, аспірантам і даследчыкам супрацоўніцтва ў форме публікацыі рэцэнзаваных матэрыялаў (артыкулаў), якія асвятляюць праблемы развіцця эканомікі, дзяржавы і грамадства.

Часопіс "Новая эканоміка" выходзіць з 2004 г. і дзейнічае на аснове Пасведчання аб рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі № 2371 ад 25 студзеня 2007 г. Заснавальнік часопіса – грамадская арганізацыя "Новая эканоміка" (Пасведчанне аб рэгістрацыі № 05/0369 ад 29 снежня 2004 г.).

Болей падрабязная інфармацыя месціцца на сайце часопіса *http://neweconomics.info*.

УНІВЕРСІТЭТ

21 студзеня 2008 года, № 1 (1973)

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

У 2007 годзе выдавецтва БДУ падрыхтавала да друку 263 арыгінал-макеты вучэбных, даведачных і навуковых выданняў. За гэты час выдадзена 240 і чакаюць сваёй чаргі 135 кніг і брашур. У ліку выдадзеных – 207 вучэбных, 29 навуковых, 4 даведачныя выданні. З грыфам Міністэрства адукацыі Беларусі выдадзены 3 падручнікі і 8 вучэбных дапаможнікаў.

Бойко Т.С. **Налоговые органы Республики Беларусь.** Вучэбна-метадычны комплекс складаецца з вучэбных модуляў, якія змяшчаюць канспекты лекцый, заданні для замацавання вывучанага матэрыялу, кантрольныя тэсты, матэрыялы для падрыхтоўкі да дыскусій і ролевых гульняў, тэматыку рэфератаў, прыклады з судовай практыкі, формы падатковай дакументацыі і іншыя вучэбныя элементы, складзеныя на аснове найноўшага заканадаўства і спецыяльнай літаратуры. Структура і змест выдання дазваляюць забяспечыць глыбокае і ўсебаковае засваенне вучэбнага матэрыялу, эфектыўна арганізаваць самастойную работу студэнтаў, ацаніць вынікі вывучэння курса.

Военному факультету БГУ – 80 лет (1926–2006). Адлюстравана гісторыя ўтварэння ваеннага факультэта, працэс ваеннай падрыхтоўкі курсантаў і студэнтаў універсітэта, удзел у ім прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта.

Ганчев П. **Возрождающийся гигант: цивилизация и философия древнего и современного Китая.** У манаграфіі да-

следуецца духоўная культура, філасофія і цывілізацыя буйнейшай па колькасці насельніцтва краіны – Кітая, які здзіўляе сёння сапраўды фантастычнымі тэмпамі росту і развіцця. Даецца глыбокі аналіз уздзеяння тысячагадовай культурнай традыцыі на самыя розныя сферы жыцця сучаснага кітайскага грамадства.

Данилевич А.А. **Уголовный процесс: Доказательства и доказывание.** Дапаможнік змяшчае рэкамендацыі для студэнтаў, якія вывучаюць матэрыялы па тэме "Доказы і даказванне" ў крымінальным працэсе.

Егорейченко А.А. **Культуры штрихованной керамики.** У манаграфіі даецца комплексная характарыстыка пляменаў міжрэчча Нёмана, Заходняй Дзвіны і Прыпяці канца II тыс. да н. э. – першай паловы I тыс. н. э. На падставе шэрагу прыкмет культура штрыхаванай керамікі падзелена на дзве самастойныя: культуру ранняй штрыхаванай керамікі, што існавала ў апошняй чвэрці II–I тыс. да н. э., і культуру позняй штрыхаванай керамікі – першай паловы I тыс. н. э.

Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы

ВІНШУЕМ!

ТАЦЦЯНІН ДЗЕНЬ

За значныя дасягненні ў журналістыцы Таццяна ПАДАЛЯК, дацэнт кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ і рэдактар аддзела культуры газеты "Звязда" атрымала спецыяльную прэмію Прэзідэнта краіны. Напярэдадні свята, Таццянінага дня, мы шчыра павіншавалі калегу.

– Таццяна Уладзіміраўна, наколькі нечаканай стала для Вас гэтая прэмія?

– У намінацыі "Журналістыка" заўсёды шмат прэтэндэнтаў, таму вылучэнне мяне і маёй працы вельмі ўзрушыла. Мабыць, ніколі ў жыцці так не хвалявалася, як перад выхадам на сцэну Палаца Рэспублікі падчас уручэння прэміі за цыкл публікацый "Нашчадкі вогненных вёсак". Адшукваем людзей, якія выжылі ў спаленых падчас вайны вёсках. Сярод журналістаў пра вайну заўсёды шмат пішуць, але ніхто сур'ёзна не піша. Гэтай тэмай займаюся з 90-х гадоў, калі пачаліся спробы перагляду і фальсіфікацыі гісторыі.

– З якімі новымі ідэямі, матэрыяламі звернецеся да чытача ў гэтым годзе?

– Мой любімы жанр – дыялог-партрэт. На старонках "Звязды" апублікавана ўжо цэлая галерэя партрэтаў вядомых асоб. Нядаўна пачала весці на журфаку майстар-клас "Тэхналогія інтэрв'ю". Хачу скласці на аснове сваіх журналісцкіх матэрыялаў вучэбна-метадычны дапаможнік і паказаць там на канкрэтных прыкладах, якім чынам збіраць інфармацыю метадам інтэрв'ю, як фармуляваць пытанні.

Спадзяюся працягваць "змаганне" са стэрэатыпам, што журналіст толькі асвятляе падзеі і не ў стане ўплываць на іх ходу. Напрыклад, калі былі зацверджаныя і выдадзеныя новыя правілы прыёму ў ВНУ, мы са здзіўленнем пабачылі, што на журфаку скасаваны творчы конкурс (сачыненне), а замест яго абітурыентам прапанавана здаваць тэставанне. Атрымлівалася, што на прэстыжны факультэт могуць патрапіць людзі, якія і двух слоў не звяжуць. Дамовіліся на інтэрв'ю з міністрам адукацыі Аляксандрам Радзьковым. У нас атрымалася сапраўдная палеміка, ледзьве не спрэчка амаль на тры гадзіны. Урэшце, паводле прынятых паправак журналістыка была ўключана ў шэраг творчых спецыяльнасцяў – і нам вярнулі творчы конкурс на ўступных іспытах. Хаця ніхто не верыў, што журналіст можа перакананаць міністра. Выдатна, што нашы міністры аналізуюць усе контраргументы.

– Як Вам удаецца сумяшчаць журналісцкую і выкладчыцкую дзейнасці?

– Гэта сапраўды вельмі складана, тым больш што чытаю паточныя лекцыі (па курсе "Прафесійная этыка журналіста". – *Заўв. рэд.*), якія звычайна патрабуюць вялікіх энергетычных выдаткаў. Аднак калі ты выкладаеш журналістыку – павінен сам быць журналістам, каб мець маральнае права на слова ў студэнцкай аўдыторыі. "Як лекара можа навучыць толькі лекар, так і добрага журналіста можа выхаваць толькі сталы журналіст", – гэта крэда факультэта журналістыкі.

– У адным інтэрв'ю Вы сказалі, што грамадства перанасычана інфармацыяй. Ці існуюць арыенціры, якія дапамогуць і чытачу, і журналісту не захлынуцца ў інфармацыйнай плыні?

– Арыенцір – слова з напаўзабытых часоў, калі гаварылі: "Чытай гэта, а не тое". А вы не заўважалі, што чым больш сціплае ў выдання афармленне, тым большая верагоднасць адшукаць там цікавы змест? Якаснае выданне друкуецца на звычайнай газетнай паперы, пазбягае "вясёлых карцінак" – буйных кідкіх загалоўкаў, "глянцу", злоўжывання колерам – і прапануе найперш інфармацыю, не падмяняючы яе прыгожай абгорткай.

Гутарыла
Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ
Фота аўтара

НАША СПАДЧЫНА

НОВАЕ АБЛІЧЧА АРХЕАЛОГІІ БДУ

На гістарычным факультэце 18 снежня 2007 г. урачыста адкрылася новая археалагічная экспазіцыя вучэбнага музея.

Кіраўніцтва і выкладчыкі гістфака на адкрыцці новай археалагічнай экспазіцыі музея.

На пачатку 1924 года ў БДУ быў створаны Музей гісторыі першабытнай культуры і рэлігіі. Неўзабаве пасля правядзення ў 1939 г. першай археалагічнай практыкі ў Херсанэсе (Крым) яго перайменавалі ў Гісторыка-археалагічны музей і сталі актыўна папаўняць матэрыяламі з экспедыцый і выпадковымі знаходкамі. На жаль, у гады вайны калекцыі былі страчаныя.

Аднавіўся музей толькі ў 1960 г. З гэтага часу яго аснову складаюць рэчы, знойдзеныя падчас археалагічных экспедыцый БДУ пад кіраўніцтвам Э. Загарульскага, Л. Міхайлоўскага, А. Мітрафанава, Ю. Драгун, якія вывучалі сярэднявечныя пласты гарадоў. З канца 1970-х гг. гэтай тэмай заняліся В. Рабцэвіч і А. Плавінскі, а гарадзішчы жалезнага веку пачаў даследаваць А. Егарэйчанка. З 2004 г. да 2007 г. ладзіліся экспедыцыі пад кіраўніцтвам В. Абухоўскага, прысвечаныя помнікам каменнага веку.

Багатыя калекцыі, якія былі назапашаныя за гэтыя гады, дазволілі распачаць працу па стварэнні ндвай, па-сучаснаму афармленай археалагічнай экспазіцыі музея, пабудаванай паводле храналагічнага падыходу ад палеаліту да новага часу.

У першай вітрыне прадстаўлены найстаражытнейшыя экспанаты – палеалітычныя прылады з крэменю, вырабы з мамантавай косткі. "Прасоўваючыся бліжэй да нашых дзён", наведвальнікі могуць убачыць найбольш характэрныя для розных эпох артэфакты: мезалітычныя мікраліты (мініяцюрныя крамянёвыя вырабы), найстаражытнейшую кераміку часоў неаліту, каменныя свідраваныя сякеры эпохі ранняй бронзы. Дзякуючы шматгадовай працы А. Егарэйчанкі (цяперашняга загадчыка кафедры археалогіі) у экспазіцыі шырока прадстаўлены матэрыялы позняга бронзавага і ранняга жалезнага вякоў з Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі, сярод якіх пераважаюць самыя разнастайныя касцяныя вырабы – прылады працы, зброя і ўпрыгожанні, а таксама вырабы з жалеза першых стагоддзяў н. э.

Намаганнямі патрыярха беларускай археалогіі прафесара Э. Загарульскага ў музеі была сабраная багатая калекцыя сярэднявечных прадметаў, сярод якіх найбольш каштоўнымі і цікавымі з'яўляюцца знаходкі з месца спаленага ў сярэдзіне XIII ст. Вішчынскага замка: ювелірныя вырабы, зброя дружыннікаў, фрагменты прычарнаморскіх амфар ды іншыя прадметы, якія належаць да так званай "элітарнай" культуры XIII стагоддзя. Э. Загарульскі з'яўляецца вядучым даследчыкам старажытнага Мінска. У асобнай вітрыне выстаўлены матэрыялы адпаведных раскопак, сярод якіх вылучаюцца выдатна захаваныя вырабы з дрэва і ўзоры сярэднявечных тканіны і абутку. Экспазіцыю ўпрыгожвае рэканструкцыя ўязной брамы тагачаснага Мінска, якую змайстравалі студэнты факультэта.

Археалагічныя экспедыцыі пад кіраўніцтвам В. Рабцэвіча і А. Плавінскага даследавалі шмат курганных могільнікаў X–XIII стст. у розных рэгіёнах краіны. Найбольш уражвае вітрына з пахавальнымі старажытнасцямі Рагачоўшчыны. Сярод экспанатаў выразна вылучаюцца комплексы жаночых упрыгожанняў – скроневыя кольцы, разнастайныя пацеркі, падвескі і г. д.

Завяршаецца экспазіцыя вітрынай, дзе адлюстравана матэрыяльная культура беларускіх гарадоў XIV–XVII стст. Тут можна ўбачыць кальчугу, побытавыя рэчы, разнастайную кафлю і г. д.

Новая археалагічная экспазіцыя вучэбнага музея гістарычнага факультэта стане добрым падмуркам для вывучэння мінулага нашай радзімы, а сабраная ў ім багацейшая калекцыя старажытных артэфактаў – значным унёскам у развіццё беларускай археалогіі.

Віталь СІДАРОВІЧ,
загадчык вучэбнага музея
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

ДОБРАЯ СПРАВА

ШЧАСЦЕ РАБІЦЬ ДАБРЫНЮ

Каляды і Новы год – час радасных і прыемных імгненняў для дарослых і дзяцей, калі ў душах пануюць лагода і дабрыня, здзяйсняюцца запаветныя мары.

Не сакрэт, што выхаванцы дзіцячых дамоў – гэта дзеці-сіроты, якія воляй лёсу засталіся без бацькоў, і таму абдзеленыя цяплом, любоўю і ўвагай. У іх жыцці так мала радасці і шчасця! Часам ім не хапае самых простых рэчаў: вопраткі, абутку, элементарных прадметаў побыту, цацак. Таму студэнтамі Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ ў чарговы раз была праведзена традыцыйная акцыя "Новы год – дзецям!" па зборы рэчаў, цацак, дзіцячых кніжак. Напярэдадні свята яны наведалі спецыялізаваны дом дзіцяці № 1, размешчаны па праспекце Газеты "Праўда", 32; дом дзіцяці № 2, што на вул. Адзінцова, 63/2; дзіцячы дом № 2 на вул. Каліноўскага, 65; дзіцячы дом № 3 для дзяцей-сірот на вул. Рафіева, 30а; дзіцячы дом № 6, што на вул. Убарэвіча, 68а; а яшчэ пабывалі ў аддзяленні сацыяльнага прытулку, размешчанага ў в. Станькава Дзяржынскага раёна. Акрамя навагодніх падарункаў, сотні дзяцей-сірот атрымалі звычайнае чалавечае цяпло, увагу і клопат. Канешне, матэрыяльных праблем у дзіцячых дамах мноства, але іх паступова рашаюць супрацоўнікі гэтых устаноў, дзяржаўныя і прыватныя арганізацыі. Аднак, бадай, самым галоўным застаецца патрэба ў спагадлівых, чуйных адносінах, душэўнай цеплыні і пяшчоце. Менавіта таму студэнты ДзІКСТ працягваюць добрую традыцыю, якая склалася ў інстытуце, каб свет, што вакол малютак, хоць на імгненне стаў ярчэйшым, святлейшым і весялейшым. Бо прыносячы шчасце іншым, мы і самі становімся лепшымі.

Юлія САЕВІЧ

КАЛЕЙДАСКОП

БРЫТАНСКІЯ СТУДЭНТЫ – САМЫЯ ЛЯНІВЫЯ Ў ЕЎРОПЕ

Брытанскія студэнты самыя лянівыя ў Еўропе: у сярэднім яны вучацца 25 гадзін у тыдзень, а многія з іх прысвячаюць вучобе ўсяго 20 гадзін у тыдзень, што ўдвая менш, чым у тых жа партугальцаў, якія знаходзяцца на другім канцы рэйтынгу.

Даследаванне праведзена Інстытутам палітыкі ў галіне вышэйшай адукацыі (Higher Education Policy Institute). Паводле яго нямецкія студэнты вучацца мінімум 34 гадзіны ў тыдзень. Самымі старанными апынуліся падлеткі Партугаліі. Яны адводзяць на вучобу 41 гадзіну – столькі ж, як студэнты Кембрыджа.

Вядома, час, затрачаны студэнтамі на вучобу, моцна залежыць ад абранай імі спецыяльнасці. Больш усяго прыходзіцца працаваць у Вялікабрытаніі медыкам і будучым стаматолагам: у сярэднім 35,9 гадзін у тыдзень – гэта паўнавартасны працоўны тыдзень.

Не дзіва, што брытанскія студэнты вельмі багата працуюць у параўнанні са студэнтамі іншых краін. У сярэднім у Вялікабрытаніі студэнты працуюць больш за 20 гадзін у тыдзень, то-бок прыкладна столькі ж, сколькі вучацца. Іх вымагае працаваць высокая плата за навучанне і высокі кошт жыцця ў краіне.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

21 студзеня 2008 года
Падпісана да друку 17.01.2008 г.
Зак. 40. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАПАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by